# Да зброі, моладзь Беларусі!

**(Прамова сакратара Цэнтральнага Камітэта Комсамола Беларусі М. ЗІМЯНІНА).**

Дарагія таварышы, маладыя сыны і дочкі беларускага народа!

Фашысты адабралі ў вас свабоду. Яны імкнуцца надзець на вас ярмо вечнага рабства, зрабіць вас рабочым быдлам тупагаловага нямецкага фельдфебеля.

Зброяй і толькі зброяй беларуская моладзь дакажа, што беларусы ніколі не былі і не будуць рабамі нямецкіх памешчыкаў і капіталістаў.

Зброяй і толькі зброяй мы вернем для беларускай моладзі і дзяцей нашы школы і інстытуты, нашы клубы і палацы піонераў, наша шчаслівае і радаснае жыццё.

Лепшы друг совецкай моладзі наш правадыр і настаўнік, любімы Сталін кінуў кліч усяму совецкаму народу — знішчыць нямецкіх акупантаў усіх да адзінага. І словы таварыша Сталіна сталі свяшчэнным лозунгам для ўсіх байцоў вялікай вызваленчай вайны. Подвігі беларускіх партызан вядомы ўсёй краіне. У іх радах, у радах народных мсціцеляў, змагаюцца маладыя сыны і дочкі Беларусі, змагаецца наша слаўная моладзь, якая ўсёй сваёй істотай ненавідзіць і праклінае крывавага Гітлера, які парушыў наша шчаслівае жыццё, абняславіў нашу маладосць, нашу волю.

Маладыя партызаны і партызанкі! Знішчайце немцаў так, як знішчаюць іх на фронце маладыя сыны беларускага народа, героі — ордэнаносцы Чырвонай Арміі, комсамольцы Алейнікаў, Грышанаў, Філіпаў, Трызна!

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі